# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

Аўтарэферат дысертацыі В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» дазваляе сцвярджаць, што даследаванне характарызуецца навізной, актуальнасцю, лагічнасцю і паслядоўнасцю ў выкладзе фактычнага матэрыялу.Дысертант эфектыўна вырашае пастаўленыя задачы і прадстаўляе першае ў айчынным і замежным мовазнаўстве маштабнае даследаванне другасных намінацый альфакторнай сферы беларускай і англійскай моў. Дзякуючы прыцягненню да аналізу лексічных адзінак розных лексіка-граматычных разрадаў слоў (субстантываў, ад'ектываў, дзеясловаў) была прадэманстравана спецыфіка рэалізацыі семантычнай дэрывацыі, у выніку якой разнастайныя паняцці атрымліваюць увасабленне ў альфакторнай прасторы, што з'яўляецца сведчаннем асацыятыўнасці чалавечага мыслення, яго абумоўленасці спецыфікай атрыманай інфармацыі і цеснай сувяззю розных сфер пазнання.

Дысертацыя, як гэта бачна з аўтарэферата, складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і трох дадаткаў. У першай главе «Катэгорыя альфакторнасці ў сучаснай навуковай парадыгме» абагульняецца вопыт даследавання альфакторных лексічных адзінак, разглядаецца шэраг айчынных і замежных работ, прысвечаных даследаванню розных аспектаў праблемы, вызначаюцца асноўныя падыходы да даследавання паху і яго розных класіфікацый. Другая глава прысвечана субстантыўным і ад'ектыўным альфакторным намінацыям. Найбуйнейшым па ахопу матэрыялу з'яўляецца раздзел «Ад'ектывы ў складзе альфакторнага кантынуума», дзе разглядаюцца другасныя альфакторныя лексіка-семантычныя варыянты, утвораныя ад першасных значэнняў прыметнікаў. Аўтар звяртае ўвагу на тое, што фарміраванне паняцця "пах" з'яўляецца вынікам апрацоўкі наглядна-пачуццёвай інфармацыі, якая паступае па адным з модусаў перцэпцыі – альфакторным успрыманні. У залежнасці ад гэтага вылучаюцца альфакторныя ЛСВ па іх прыналежнасці да прадмета-крыніцы; паводле тыпу дэфініцыі зыходнага ЛСВ, ад якога ўтварыўся альфакторны ЛСВ; па наяўнасці эмацыянальна-ацэначнага кампанента; па суаднесенасці з крыніцай метафарычнай экспансіі і інш.

У раздзеле «Субстантывы ў складзе альфакторнага кантынуума» разглядаюцца другасныя намінацыі альфакторных субстантываў, семантычная дэрывацыя якіх ажыццяўляецца па трох мадэлях: прамой, дзе ад неальфакторных ЛСВ утвараюцца альфакторныя лексіка-семантычныя

варыянты; адваротнай, калі альфакторныя намінацыі фарміруюць неальфакторныя другасныя значэнні; дэрывацыі без выхаду за межы альфакторнага калідора, у якой першасныя і другасныя намінацыі з'яўляюцца альфакторнымі. У трэцяй главе разглядаюцца дзеясловы са значэннем вылучэння пахаў, іх успрымання і распазнавання, а таксама ўздзеяння паху на наваколле. Усе яны звязаны з канкрэтнымі фізічнымі дзеяннямі, фізіялагічнымі працэсамі і станамі.

У альфакторным кантынууме беларускай і англійскай моў фіксуюцца лексічныя адзінкі, якія характарызуюцца як агульнымі, так і спецыфічнымі рысамі, і па характары сэнсавай суаднесенасці ў кожнай з моў аб'ядноўваюцца ў групы з адносінамі супадзення, частковага супадзення і несупадзення(безэквівалентнасці).

Паспяховаму вырашэнню пастаўленых у дысертацыі задач садзейнічала канструктыўная методыка даследавання, выпрацаваная ў адпаведнасці са спецыфікай аб'екта і прадмета даследавання. Абгрунтаванасць і дакладнасць палажэнняў і вывадаў пацвярджаецца багатым фактычным матэрыялам.

Зыходзячы з інфармацыі, прадстаўленай у аўтарэфераце, дысертацыя В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» з'яўляецца завершаным і арыгінальным навуковым даследаваннем, у якім на высокім навуковым узроўні прапануецца вырашэнне пастаўленых у працы задач. У сувязі з гэтым лічу, што аўтар дысертацыі «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» Жук Васілій Ігаравіч заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства.

Дацэнт кафедры славянскіх моў МДЛУ,
кандыдат філалагічных нвук, дацэнт В. Т. Іватовіч-Бабіч